03153

Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 3 | Вільня, Пятніца 30 Студзеня 1931 г. | Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Самаўрад і Беларусы.

Гаварыць аб самаўрадах на Беларусі — гэта ўсёроўна, што праводзіць параўнаньне паміж самаўрадам на паперы і самаўрадам у сапраўднасьці. Гэтак было ад пачатку, калі пачалося гаварыцца аб г. зв. земствах, за часоў царскіх, гэтак ёсьць сяньня і гэтак будзе датуль, пакуль на белаларускіх землях непадзельна пануе ўрадавая бюрократыя. Бо і што-ж сапраўды прадстаўляе сабой самаўрад?

У найагульнейшым значэньні гэта ёсьць **учасьце мясцовых людзей у выконываньні заданьняў публічнага жыцьця:** адміністрацыйнага (самаўрад тэрыторыяльны, напр. гмінвы), культурнага (— школьны) і гаспадарчага.

Гэткае ўчасьце ў публічным жыцьці, аднак Беларусам, як народу, блізу 400 гадоў ня маючаму сваей дзяржаўнасьці, не даступна. І таму на беларускія землі не дакаціўся прадваенны, куртаты хоць-бы самаўрад у форме расейскіх земстваў і таму так цяжка йдзе з самаўрадам на беларускіх землях пасьля вайны, абапал рыжскай граніцы. Мы тут стрымаймося аб самаўрадзе на Беларусі пад Польшчай.

Польскае ўстаўадаўства аб самаўрадах ад самага пачатку ня мела шчасьця і самі Палякі называюць яго „шырокім, але імглістым". Апрача агульніковых акрэсьленьняў у Констытуцыі з дня 17. III. 21 г. (арт. 65, 67, 69, 70, 71 і 73), усё амаль самаўрадавае жыцьцё ў нас дагэтуль рэгулюецца кабінэтнымі цыркулярамі і распараджэньнямі. Дык маемо права і абавязак перадусім дамагацца ад уставадаўчых органаў, каб усе самаўрадавыя справы былі ўрэшце унормаваны пісанымі ўставовымі законамі, якія ніколі і нікім ня былі-б гвалчаны. Пры ўкладаньні самаўрадавых уставаў для нашага краю мусіць быць узята пад увагу, што абсолютная большасьць ягонага насельніцтва гэта — Беларусы, якія ні пад якім відам ня могуць быць разгляданы, як матэрыял да асыміляцыі, але як роўнапраўны Народ.

Уважаем так-жа за патрэбнае зазначыць тут з усёй станоўчасьцю, што час ужо найвышэйшы зволніць нашу вёску з абоймаў „паноў войтаў", з каторымі беларускі селянін, ня ўмеючы папольску, ня можа згаварыцца. Наагул, трэба ўрэшце перастаць займацца прывозам на нашы землі „расовых" нашэльнікаў „культуры", а цэлае самаўрадавае будаўніцтва наставіць паводле правіла: „самаўрад для народу", а не наадварот.

Гэта малая толькі часьць нашых самаўрадавых ня гэтулькі пажаданьняў, колькі напамінаньняў да тых, хто хваляцца сягоньня, як прававітыя прадстаўнікі ад нашага краю ў польскія уставадаўчыя палаты — Соймі Сэнат.

Ці пачуюць наш голас? — Веры ў гэта ня маем, бо гэтыя людзі трымаюць уладу не ад учора і дараць Беларусаў школьнымі ўставамі, якія пазваляюць здабыць урадовую беларускую школу не раней, як за сем гадоў.*) Гэтыя-ж людзі, пад відам гаспадарчай успамогі нашага краю, стараюцца стварыць тут ні больш ні менш як „уборысты рынак для прадуктаў польскай культуры."**)

Для лягчэйшага зразуменьня варта дадаць, што абодва прыведзеныя прыклады — гэта толькі „кветачкі", якімі пераможнікі з апошніх выбараў (параўнай даты!) пачынаюць „бавіць" сваіх беларускіх выбаршчыкаў: „ягадкі" йшчэ наперадзе і яны для Беларусаў салодкімі ня будуць, напэўна!

Сяньня мы так слабы, што на ўсе нашы крыўды з годнасьцю арганізаванага Народу нават не патрапімо адказаць. Верма аднак, што гэта слабасьць толькі пераходная і мусіць быць выкарыстана, як перадышка і як дзейнае прыгатаваньне да шырокай працы ў кругу вузейшым, у самаўрадзе, у гміне, дзе трэба выкарыстаць усё магчымае. Бо — кажачы за Б. Коскоўскім—„якіякольвечы лёсы чакаюць наш край, у якіхкольвечы граніцах будзе абяртацца наша свабода чыну, заўсяды мусімо пачынаць ад першага зьвяна краёвай адміністрацыі, ад гміны, там выклікаючы на публічную арэну новыя энэргіі, мазгі і волю, там перадусім падносячы ровень грамадзкага жыцьця, там змушаючы людзей да разважаньня і да пастанаўляньня ўва ўласных і агульных справах". *)

Так, гміна ёсьць школай публічнага жыцьця і то — школай добрай! І хто ведае, ці віну за тое, што Беларусы пад Польшчай раптам апынуліся быццам выкіненымі з сядла ў палітычным жыцьці, ня трэба прыпісаць якраз таму, што гмінныя самаўрады былі пушчаны Беларусамі амаль самапасам? У кожным разе наказам найбліжэйшай будучыні для Беларусаў мусіць быць увага на гмінныя самаўрады і на іхныя патрэбы, а найбліжэйшай задачай у гміне — знайсьці сродкі і магчымасьці на пазашкольную асьвету агульную і спэцыяльна земляробскую.

*) Распараджэньне Прэзыдэнта Р. П. з дня 29. XI. 1930 г.

**) Гэтак сказаў на банкеце д. 6. І. 31 г. аб заданьнях сваей працы б. міністр Зямельнай рэформы В. Станевіч.

*) B. Koskowski: Polityka gminna.

АДОЗВА

да беларускіх арганізацыяў, інстытуцыяў і працаўнікоў на ніве беларускага нацыянальнага адраджэньня.

Кожны народ мусіць бараніць і змагацца за свае аснаўное права — існаваньня сваей нацыі.

Гэтае заданьне Беларускага народу павінны выконываць беларускія народныя арганізацыі і інстытуцыі, а так-жа і паасобныя працаўнікі на ніве беларускага народнага адраджэньня.

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, які складаецца з прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацыяў і інстытуцыяў, трымаючы горда і сьмела бела-чырвона-белы сьцяг Беларускага народу ў Зах. Беларусі і Усходняй Літве, не аднойчы заклікаў беларускае грамадзянства да поўнага аб'яднаньня пад сваім сьцягам, дзеля мацнейшага змаганьня за правы Беларускага народу.

Ня ўсе аднак хацелі зразумець патрэбу аб'яднаньня беларускіх сіл пад сьцягам народнага аўторытэту.

Пачаўшыся падзел у беларускім грамадзянстве у 1925 годзе, пачынальнікі яго бязупынна рознымі спосабамі гэты падзел паглыблялі і паглыбляюць.

У выніку гэнае шкоднае працы і варожых адносін да нас сільных гэтага сьвету, беларускі народны арганізм аказаўся сусім аслаблены.

Дзеля гэтых прычын вынікі апошніх выбараў у польскі парлямант былі для нас вельмі сумныя. Беларускі народ ня мог яшчэ абараніць самога сябе.

Але справа ня ў выбарах, а ў **народзе**. Беларуская справа на выбарах не пачалася і на выбарах не канчаецца. Беларуская справа—гэта самабытнасьць Беларускага народу.

Вось-жа дзеля ўмацненьня беларускага народнага арганізму Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту заклікае беларускія арганізацыі і інстытуцыі, а так-жа і паасобных дзеячоў узмацніць сваю дзейнасьць у змаганьні за аснаўное права Беларускага народу, гуртуючыся каля Бел. Нац. К-ту.

Вільня 21. I. 1931 г.

Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту.

Беларускі Нацыянальны Камітэт.

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні існуе ад 1919 году.

Бел. Нац. К-т зьяўляецца найвышэйшай народнай інстытуцыяй беларусаў пад Польшчай.

Бел. Нац. К-т складаецца з прадстаўнікоў беларускіх народных арганізацыяў, якія стаяць на беларускім народным незалежным грунце.

Мэта Бел. Нац. К-ту — абарона нацыянальных правоў беларускага народу.

У працягу свайго існаваньня Б. Н. К-т. адыграў вялізарную ролю ў беларускім адраджэнскім народным руху пад Польшчай, бароняччы чысьціню беларускай народнай ідэі.

Вельмі цяжкі мамэнт працы для Б. Н. К-ту быў 1927 год, калі ворагі беларускага народнага адраджэньня, праз здраднікаў беларускай народнай справы, пасягалі на існаваньне Н. К-ту, захапіўшы прэзыдыяльную ўладу ў К-тэце, каб пакіраваць беларускі народна-адраджэнскі рух пад Польшчай на згубны шлях. Дзякуючы аднак стойкасьці беларускіх незалежных арганізацыяў, народны аўторытэт і чысьціню народнай ідэі К-т захаваў надалей.

У свой час „Б. С. Р. Грамада" імкнулася да поўнай манаполі беларускага народнага адраджэнскага руху пад Польшчай.

„Грамада", як ведаем, складалася з варожых для беларускай справы элемэнтаў з учасьцем у ёй беларускіх народнікаў — у гушчах беларускай сялянскай масы. Даказываць гэтага цяпер ужо ня прыходзіцца. Праўдзівасьць гэтага сьцьвярджаюць усім ведамыя факты. Правадыры і кіраўнікі „Грамады" пасьля яе разгрому пайшлі хто куды і кожны з іх па сваей дарозе.

А. Луцкевіч з кумпаніяй заснаваў кірунак беларуска-польскай санацыі, каб служыць Варшаве, а Б. Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і таварышы пайшлі на службу Маскве.

Вось-жа яшчэ ў 1927 годзе беларускія незалежныя арганізацыі ў Вільні склікалі на

Выпісывайце каталёг беларускіх кніг, а з яго абазначаныя чырвоным атрамантам па таннай цане кніжкі!
Беларуская кнігарня „Пагоня"
Лудвісарская 1. Вільня.

2 ліпня 1927 году агульны сход Беларускага Нацыянальнага К-ту і выбралі прэзыдыюм К-ту, у склад якога не правялі аніводнага прадстаўніка з тагачаснай „Грамады". Такім чынам быў абаронены Бел. Нац. К т, які вытрымаў у сваіх руках горда і сьмела аж да сяньняшняга дня бел-чырвона-белы беларускі народны сьцяг.

Пасьля адваяваньня поўнае незалежнасьці ад чужацкіх уплываў, К-т пачынае консолідаваць беларускія народныя сілы, заклікаючы да аб'яднаньня беларускія народныя арганізацыі пад сваім сьцягам. Каб не ўвайшлі ў Нац. К-т варожыя беларускай справе элемэнты дзеля ўзарваньня беларускай народнай сілы ўнутры, К-т забясьпечыўся адпаведным рэгулямінам, паводле якога прыймаюцца ад арганізацыяў прадстаўнікі ў склад Нац. К-ту.

Апрача абароны чысьціні беларускай ідэолёгіі ўнутры і консолідацыі народных сіл, Нац. Камітэт вельмі часта выступае агулам у абароне беларускіх народных правоў.

У 1927 годзе Б. Н. К-т выслаў мэмарыял да Віленскага Каталіцкага арцыбіскупа з дамаганьнем увядзеньня ў Віленскай Каталіцкай Духоўнай Сэмінарыі навучаньня беларускай мовы, беларускай літэратуры і беларускай гісторыі. Запратэставаў: — процiў пасаджэньня кс. В. Гадлеўскага замест у кляштар — у Макатоўскую турму, процiў пагвалчаньня беларускай мовы ў Жодзішным касьцеле, — процiў пагвалчаньня беларускае мовы ў Барадзеніцкім касьцеле. Выслаў мэморыял у Праваслаўны Сынод у Польшчы ў справе беларусізацыі Віленскай Праваслаўнай Сэмінарыі. Выслаў прадстаўніка на Кангрэс Нац. Меншасьцяў у Жэнэву.

У 1928 годзе Б. Н. К. так-жа паслаў прадстаўніка на Кангрэс Нац. Менш. у Жэнэву. Заапякаваўся дапамогай на паездку прадстаўніка беларускага студэнства ў Парыж на Кангрэс міжнароднага студэнства. Сваім аўторытэтам рабіў захады дзеля ўспакаеньня прэсавай грызьні між паасобнымі беларускімі групамі. Выступіў з заклікам да аб'яднаньня беларускіх арганізацыяў і ў гэтай справе даручаў прэзыдыюму весьці перагаворы з некаторымі групамі дзеля аб'яднаньня. Прымаў справаздачы з дзейнасьці Беларускага Пасольскага Клюбу і кіраваў яго палітыкай.

У 1929 годзе Б. Н. К. выступіў з пратэстам процiў забароны Віленскага каталіцкага арцыбіскупа належаць каталіком да Бел. Хр. Дэмокр. і чытаць „Бел. Крыніцу".

У 1930 годзе Б. Н. К. супольна з Літоўскім Тымч. Нац. Камітэтам ладзіў сьвяткаваньне 500 лецьця сьмерці Вялікага Вітаўта, князя Літвы і Беларусі. Аб'ядноўваючы амаль усе жывыя беларускія арганізацыі, К-т заклікае беларусаў да поўнага аб'яднаньня і перасьцерагае, каб на выбары ў польскі парлямант не разьбіваліся на групы, а ішлі адзіным беларускім фронтам.

Апрача гэтага трэба залічыць да большае вагі спраў і ладжаньне ўгодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі, якія Нац. К-т ладзіў з учасьцем прадстаўнікоў іншых народаў, асабліва Літвіноў і Украінцаў.

У сучасны мамэнт Беларускі Нацыянальны Камітэт аб'ядноўвае ў сабе 10 беларускіх народных арганізацыяў і інстытуцыяў, у гэтым ліку групы палітычныя, культурна-прасьветныя таварыствы і інш. Складаецца Нац. К-т з 22 прадстаўнікоў аб'яднаўшыхся ў Нац. Камітэце арганізацыяў.

п—к

Беларуска-літоўска-ўкраінская салідарнасьць у Амэрыцы.

Дня 21 сьнежня 1930 году ў м. Шыкаго ў Амэрыцы адбылося веча наладжанае ўкраінскімі арганізацыямі м. Шыкаго й ваколіц у справе васеньніх падзеяў у Галіччыне, дзе праводзілася польскімі ўладамі г. зв. „пацыфікацыя".

На гэтае веча зышлося больш 3-х тысяч асоб: украінцаў, беларусаў і літоўцаў.

На вечы прамаўлялі: украінцы, літоўцы і беларусы.

Ганаровым маршалкам веча і першым прамоўцам быў патрыярх украінскае эміграцыі ў Амэрыцы др. Ул. Сіеменовіч.

Ад беларусаў прамаўляў старшыня Беларуска-Амэрыканскага Саюзу Язэп Варонка, які між іншым сказаў: — „беларусы ідуць разам з украінцамі ня толькі тут у Амэрыцы, але і на бацькаўшчыне... Гэта ёсьць нашай жыцьцёвай і гістарычнай справай. Наша доля аднолькавая".

Ад літоўцаў прамаўляў ведамы дзеяч праф. Ф. Мастаўскас, заступнік пракурора штату Іллынойс, які ў сваей прамове падкрэсьліў патрэбу супольнага фронту між украінцамі, літоўцамі і беларусамі.

Апрача ўспомненых прамоўцаў выступалі так-жа і многія іншыя, у гэтым ліку амэрыканскія журналісты і рэдактары газэт у Амэрыцы.

Аб прамовах і пастановах на гэтым вечы праз шыкагаўскую радыё-станцыю інфармавалі ўсю Амэрыку.

А. С.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Паседжаньне Прэзыдыюму Беларускага Нацыянальнага К ту. На паседжаньні Прэзыдыюму Бел. Нац. К-ту, якое адбылося 21.I. с. г. пастаноўлена склікаць агульны сход К-ту ў нядзелю 1 лютага с. г. на гадзіну 4 дня. Парадак дня на агульны сход Б. Н. К-ту прыгатаваны ў наступным відзе: 1) Справаздача Выбарнага К-ту, 2) Даклад пасла Ярэміча аб сучаснай палітычнай і гаспадарчай сытуацыі, 3) Бягучыя справы.

На гэтым паседжаньні Прэзыдыюм К-ту пастанавіў выдаць адозву, якую ў гэтым нумары зьмяшчаем.

Агульны сход Віленскага гуртка Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры адложаны. Назначаны на 25 г. м. сход Віленскага гуртка Б. І. Г. і К. не адбыўся. Сход гуртка Інстытуту адбудзецца ў нядзелю 1 лютага с. г. а гадзіне 6 увечары ў памешканьні Ц. У. Інстытуту, Людвісарская 1—19.

Першыя крокі публічнага выступленьня падвіленскай беларускай моладзі ў змаганьні за аснаўное права Беларускага народу.

Моладзь в. Юшкі, каля Вільні, зарганізаваўшыся ў гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры, многа ўжо працуе над адраджэньнем падвіленскіх беларусаў. Маючы ў вёсцы беларускую бібліятэку-чытальню і выпісваючы амаль усе беларускія газэты, пашырае і паглыбляе яна ў сваіх ваколіцах беларускую народную сьведамасьць. У часе Каляд — 26 сьнежня 1930 г. зладзіла беларускае прадстаўленьне. Адыграны быў сцэнічны твор „Выбары старшыні" і прадэклямавана многа беларускіх вершаў. Зацікаўленьне праявай беларускага культурнага жыцьця сярод падвіленскага сялянства вялікае.

Пракуратура ня хоча згадзіцца з апраўданьнем б. пасла Ю. Сабалеўскага. Пасьля апраўданьня Ю. Сабалеўскага Апэляцыйным судом, пракуратура шукае спосабу, каб панавіць суд над Сабалеўскім. У гэтай справе пракурор зьвярнуўся ў Апэляцыйны суд з просьбай прадоўжыць тэрмін касацыі ў Найвышэйшы суд.

Фацэція ў завулку беларуска-польскай санацыі. Нядаўна галоўны лідэр беларуска-польскай сучаснай палітыкі, ведамы палітычны афэрыст пан Антоні, адамкнуўшы падабраным ключом кватэру пана Фабіяна, „пазычыў" прыватныя і няпрыватныя дакуманты апошняга.

Цікава, на што гэтыя дакуманты яму так спатрэбіліся, калі здабыў іх аж гэтакай дарогай.

У гэтай справе маральным абавязкам віленскага беларускага грамадзянства ёсьць дакладна высьвятліць воблік і ролю пана Антоняга сярод беларусаў.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Падгатоўка да судовага працэсу над беларусамі. Бальшавіцкія газэты падаюць, што падгатоўка да паказовага працэсу над арыштаванымі беларускімі дзеячамі ў Менску ўжо на заканчэньні. Падсудным закідаюць маскоўскія камуністы змову з Польшчай у

Прамова пасла Ф. Ярэміча

сказаная ў Соймавай камісіі ў часе дыскусіі над буджэтам Мін. Асьветы 14-I.31 г.

Высокая Камісія! Пазваляю сабе прадставіць Камісіі жудасную гісторыю беларускага школьніцтва. Беларускія прадстаўнікі ў парляманце кожны год гаварылі аб патрэбах беларускага школьніцтва і аб паправе яго, але гэтая справа замест палепшыцца— з кожным годам пагаршалася.

За часоў нямецкае акупацыі беларускае грамадзянства надлюдзкімі натугамі стварыла 200 беларускіх школ. У часы г. зв. польскага романтызму ў гадох 1920-22 Беларусы мелі 401 школу. У 1929-30 г. Беларусы маюць 20 школ беларускіх і са два дзесяткі г. зв. утраквістычных, якія фактычна ёсьць школамі польскімі.

Калі зьвярталася беларускае грамадзянства да п. Міністра або Куратараў у справе беларускай школы, — ім адказвалі: „маеце сваіх прадстаўнікоў у Сойме, няхай яны пастараюцца, каб у буджэце асыгнавалі на вашы школы грошы, а мы пастанову Сойму выканаем".

А тымчасам школьныя інспэктары рабілі сваё — на мейсца школ беларускіх арганізавалі школы польскія.

Урэшце ў мінулым 1930 годзе Сойм на беларускія школы прызнаў 500 тысяч зл. у буджэце. Буджэт гэты, як нязначны, мог толькі зрабіць пачатак у беларускім школьніцтве, але сам факт многім беларусам паказаўся выхадам з зачараванага кола і здавалася, што справа беларускага школьніцтва выйдзе з пад апекі ўладаў бясьпечнасьці. Тады і п. Чэрвінскі процiў гэтага буджэту ня выступаў і абяцаў нават пастанову Сойму выканаць.

Але кажуць, што ў Польшчы ёсьць два ўрады — афіцыяльны і неафіцыяльны, дык мусіць гэты неафіцыяльны прыказаў афіцыяльнаму, каб гэтага буджэту ня выконываў.

Пан міністар Чэрвінскі, маючы буджэт на беларускае школьніцтва і не жадаючы яго выканаць, ня прыняў вясной беларускай дэлегацыі, якая зьвярталася ў гэтай справе, а толькі сказаў праз сваю сэкрэтарку, што аб гэтым буджэце будзе гаварыць у восень, гэта тады, калі буджэт ужо мусіў быць выкананы.

Пасьля выбараў гэтыя адкладзіны высьніліся. Пан міністар хіба што ведаў аб разьвязаньні Сойму і назначэньні выбарнага эмісара на беларускія землі п. Голувкі. Тады ўжо было яму пэўна ведама, што прадстаўнікі ад беларусаў у парлямант ня ўвойдуць, а гэтым самым і справа буджэту на беларускае школьніцтва раз назаўсёды перакрэсьліцца. Як бачым, п. міністар усім замураваў той вылам, які быў зроблены ў мінулым годзе.

Цяпер горшыя часы для беларускага школьніцтва, як за часоў міністра Грабскага, які, згаджаючыся на „уставу языковую", а робячы яе для заграніцы, рабіў хоць выгляд забясьпячэньня нашай школы. Праўда, беларусы гэтай уставай не захопліваліся, але была хоць магчымасьць змаганьня за беларускую школу. Цяпер маем дэкрэт Прэзыдэнта з дня 29.XI.1930, дзе сказана, што мова навучаньня ў школе можа быць зьмененай толькі за 7 гадоў ад дня апошняе пастановы, акрасьляючай выкладовую мову ў данай школе, — г. зн. ніколі.

Мушу також тут прыпомніць, што не адкрыты курсы для беларускіх вучыцялёў, ня выданы падручнікі, ня выдана ўсяе сумы, бо толькі некалькі тысяч зл., на даканчэньне будовы бурсы ў Навагрудку. Праўда, вучыцельская сэмінарыя ў Вільні адкрыта, як быццам беларуская, але вельмі ей шмат чаго патрэбна, каб яна была сапраўды беларускай.

У справе рэлігійнай дзеецца тое самае. Так напр. у Віленскай Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі заведзена выкладовая мова польская, дзе гадуюцца духоўнікі для беларускага народу!

Уносячы свае папраўкі да гэтага буджэту стаўлю наступныя пазыцыі: 150 тысяч зл. на вучыцельскія курсы, 150 тысяч зл. на даканчэньне бурсы ў Навагрудку, 50 тысяч зл. на падручнікі і 150 тысяч зл. запамогі для Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

справе падняцьця паўстаньня у Усходняй Беларусі.

Заграні́чныя газэты пішуць, што бальшавікі пры помачы гэтага працэсу над беларусамі стараюцца стварыць у С.С.Р.Р. такую апінію аб беларусах, каб ім лягчэй удалася пазбавіць Беларусь нават і тых куртатых правоў, якія яна мела да гэтай пары.

Сам старшыня С.С.Р.Р.— Калінін ня вытрываў і заявіў публічна, што самаўпраўленьне Беларусі ёсьць пагрозай цэласьці С.С.Р.Р.

Грамадзяне!

Наша газэта „Бел. Крыніца“, якая друкуецца лацінкай і гражданкай і выходзіць раз у тыдзень, на 1931 год з перасылкай каштуе ў краі на год 4 зл., на паўгода 2 зл., на тры месяцы 1 зл.; заграніцу ўдвая даражэй.

Хто прышле да 1 сакавіка 1931 г. падпісную плату за газэту на цэлы год – 4 зл., таму высылаем па атрыманьні грошай **бясплатную прэмію** — 5 беларускіх кніжак, якія кожны сабе можа выбраць з ніжэй паданага кнігасьпісу:

Андэрсэн Ганс Хрыстыян — Казкі.
Bahušewič Fr. (Maciej Buračok) — Dudka Biełaruskaja.
Додэ А. — Сэкрэт Дзядзькі Карніля і іншыя францускія творы ў перакладах.
Дуж-Душэўскі К. і В. Ластоўскі — Слоўнік геомэтрычных і трыгономэтрычных тэрмінаў і сказаў.
Dwornik Dr. Fr. — Życcio Św. Wacława.
Грышкевіч Фр. — Веснавыя мэлёдыі.
J. Jörgensen — Prypowieści.
Kazłoŭščyk Ul. — Ab fizyčnym wychawańni ŭ Biełarusaŭ.
Kazłoŭščyk Ul. — Fizyčnaje wychawańnie hramadzianstwa.
Kazłoŭščyk Ul. — Biełaruskija narodnyja pieśni z Sakolskaha pawietu.
Sałaŭjowa P. (Allehro) — Cudoŭnaja noč. Sceničny twor dla dziaciej u 1 dziei.
Сьпявак Блондэль — Англійская легенда.
Віппэр Р. — Падручнік Новай Гісторыі.
„ „ — Падручнік Навейшай Гісторыі.
З роднай нівы — Зборнік прыгожага пісьменства, папулярнае веды, інфармацыяў аб грамадзкім жыцьці і ўставах.

Апрача выбраных 5-ці кніжак дадаецца яшчэ так-жа бясплатна насьценны календарык „Б. Крыніцы“ на 1931 г.

УВАГА. Паведамляем, што нашу газэту „Бел. Крыніцу“ ад Новага Году пасылаем **бясплатна толькі супрацоўнікам**, якія прысылаюць у рэдакцыю стацьці, карэспандэнцыі і весткі аб жыцьці сваей старонкі. Усім-жа іншым ад Новага Году газэту спынілі.

Рэд. і Адм. „Беларускай Крыніцы“
Вільня, Людвісарская вул. № 1—19.

З Польшчы.

З Сойму і Сэнату. Пасьля кароткага перарыву, дня 26.I с. г. пачаліся паседжаньні пленуму Сойму і Сэнату. На паседжаньні Сойму была разглядана справа „пацыфікацыі“ у Галіччыне, прапазыцыі ўкраінцаў у гэтай справе адкінуты галасамі Б. Б. Адкінута так-жа прапазыцыя апазыцыі ў справе падзеяў у Берасьцейскім вастрозе.

Для Б. Б. гэтыя справы ня важныя, а маючы большасьць у парляманце зрабілі іх афіцыяльна ня так важнымі і ў Польшчы.

У той самы дзень разглядалася Берасьцейская справа і ў Сэнаце. Але і там такжа, як і ў Сойме, большасьцяй галасоў яе адкінулі.

Безрабоцьце расьце. У апошнія часы ў Польшчы безработных налічваецца 332.124 асобы.

Справа Праваслаўнай Царквы. Галосная ў мінулым годзе справа склі́каньня Сабору ўсё заціхае і аддаляецца. Да гэтае пары яшчэ не адбылося і Прадсаборнае Сабраньне, якое мае падгатаваць Сабор. У апошнія часы на нарадзе ў Мін. Веравызнаньняў Мітрапаліта Дзяніса яшчэ аканчальна ня вырашана, на калі мае быць склікана Прадсаборнае Сабраньне.

Словам, з упарадкаваньнем Праваслаўнай Царквы ў Польшчы не надта сьпяшаюцца.

З заграніцы.

Ліга Народаў. Дня 19 г. м. пачалася 62-ая сэсія Рады Лігі Народаў у Жэневе. На гэтай сэсіі разглядаліся справы падзеяў на Горн. шлёнску і польска-літоўскага спору.

Справу падзеяў на Горн. Шлёнску рэфэраваў прадстаўнік Нямеччыны мін. Курціюс, які востра заатакаваў Польшчу, закідаючы ей нарушэньні дагавору аб меншасьцях. Прадстаўнік Польшчы мін. Залескі цьвердзіў, што ў Польшчы абходзяцца з народнымі меншасьцямі сусім добра і па закону!

С.С.Р.Р. Камуністы цяпер маюць многа хлопатаў, каб правясьці пасваяму перавыбары ў мястовыя і сельскія саветы, якія скора адбудуцца ў ва ўсім С.С.Р.Р. Камуністы стараюцца падабраць людзей у саветы на мяйсцох, каб больш настроіць увесь свой дзяржаўны апарат дзеля праводжаньня колектывізацыі.

Дзеля гэтага, камуністы пусьцілі ў ход увесь свой выпрабаваны апарат бальшавіцкіх выбараў. Але і сялянства, чуючы сваю згубу ў камуне, падгатаўляецца да барацьбы з камуністамі ў гэтых выбарах.

Гавораць аб разаружэньні і зброяцца Італьянскія карабельныя фабрыкі, якія нядаўна ня мелі чаго рабіць, цяпер атрымалі заказ пабудаваць: для Аргентыны панцырны карабель, для Расеі 3 ваенныя караблі, для Парагваю тры ваенныя караблі, а такжа тры ваенныя караблі і тры падводныя лодкі для Турэччыны. Па два ваенныя караблі для: Грэцыі, Румыніі, Пэрсіі і Урагваю.

Вось як выглядае разаружэньне, аб якім так шмат гаворыцца ў сьвеце!

Пагроза далейшага гаспадарчага крызісу. Паводле вестак з міжнароднага збожавага рынку:

З 1930 году на год сёлетні асталося запасу неспажытай пшаніцы каля 340 мільёнаў пудоў.

Сёлетні 1931 год пачынаецца з вельмі добрым ураджаем на поўдні зямельнай кулі.

У Амэрыцы вялізарныя абшарам фармы вельмі многа прадукуюць збожа. Гэтыя фэрмы абапёртыя на вялікім капітале выгналі ўжо 4 мільёнаў драбнейшых фэрмараў з іх зямлі. Сьвіней кормяць пшаніцай, а ў Канадзе ў гаспадарках паляць ячменем у печы.

Ураджай, які мусіць быць прычынай агульнай радасьці, бо забесьпячае кожнаму кавалак хлеба, у сяньняшнія часы зьяўляецца прычынай гаспадарчага крызісу і агульнай бядой. Збожа перастала быць заспакаеньнем голаду людзкога і зьяўляецца сяньня толькі таварам у руках капіталістаў.

З краю.

Раз'юшаны бык напаў на людзей. У фальварку Занямэнак, Маладэчанскага пав., надовячы сарваўшыся з увязі бык, вырваўся з хлява на падворак і напаў на дзяцей, якія гулялі на дворышчы. Аднаго хлопчыка бык падкінуў рагамі ў гору, але хлапчук упаўшы ў мягкі сьнег астаўся жывы. Пасьля гэтага бык напаў на ўзрослага мужчыну П. Вешберэя, катораму прабіў рагамі бок і бруха. Расправіўшыся з Вешберэям, напаў на хлапчука В. Барана, якога падкідаючы рагамі забіў на сьмерць.

Вешберэя цяжка раненага адвязьлі ў шпіталь.

Прагавітасьць завяла ў вастрог. У Куранецкай гм., Вялейскага пав., здарыўся выпадак, які вельмі яскрава сьведчыць аб шкоднасьці для чалавека прагавітасьці. Нехта В. Дуркоўскі прабыўшы 17 гадоў у Амэрыцы вярнуўся ў родную вёску з некалькі тысячамі зробленых даляраў. Да сваей маленькай гаспадарачкі дакупіў ён зямлі і жыўбы пэўна без вялікае бяды, каб не паганая прагавітасьць.

Дуркоўскі будучы ў Амэрыцы застрахаваўся на выпадак сьмерці на 2000 даляраў, якія атрымаліб пасьля сьмерці Дуркоўскага яго спадкабернікі. Дуркоўскаму захацелася гэтыя 2000 даляраў атрымаць жывучы. Дзеля гэтага Дуркоўскі зрабіў сабе фальшывую мэтрыку, што ён памёр, і паслаў яе ў Амэрыку ў страхавое бюро з просьбай, каб выслалі грошы яго жонцы. Страхавое бюро грошы 2000 даляраў выслала праз амэрыканскі консулят у Варшаве, які сьпярша, пакуль выплаціць гэтыя грошы, патрэбаваў праз польскі ўрад сьцьверджаньня факту сьмерці Дуркоўскага і жыцьця найбліжэйшых яго спадкабернікаў. Гэткім парадкам выкрылася, што Дуркоўскі жыве і добра маецца. Тады Дуркоўскі, баючыся турмы, прабаваў уцячы заграніцу, але на граніцы яго злавілі і пасадзілі ў вастрог.

Да нас пішуць.

ПАРА ПРАЧНУЦЦА.

в. Бомбалы, Валожынскага пав. Наша вёска яшчэ сьпіць сном цемры. Аб газэце і кніжцы ніхто ня толькі не падумае, але ўважае гэтыя рэчы толькі для паноў на забаўку. Моладзь, калі дзе зловіць залатоўку, аддае яе на атруту — гарэлку.

Дык пара прачнуцца, пара выганяць з вёскі цемру. Трэба выпісываць і чытаць свае родныя беларускія газэты. Яны нам памогуць выгнаць з вёскі цемру, а з цемрай і бяду. В.

ЗАКОН І ДОБРАЯ ВОЛЯ.

Новая-Мыш, Баранавіцкага пав. Дзе ёсьць добрая воля, там і закон мае сілу і сваё значэньне. Бяз добрае волі закон ня мае ніякага значэньня і астаецца толькі мёртвай літарай, які існуе для замаляваньня вачэй другім.

Гэтак ёсьць і з законам з дня 31 ліпня 1924 г., у якім гаворыцца аб правох беларускае школы.

Жыхары нашае гміны ў свой час падалі дэклярацыі школьнаму інспэктару з просьбаў адчыніць беларускую школу ў вёсцы Муцькаўцах. Зрабілі ўсё фармальна, як вымагаецца законам, і чакалі выкананьня закону з боку польскае ўлады. Дзеці цешыліся, што будуць вучыцца ў роднай беларускай школе, а бацькі іхныя з верай у моц закону з задаваленьнем пахваляліся суседзям на рынках і зборках, што адкрылі беларускую школу для сваіх дзяцей. Але ня тут яно было. Улады школьныя адкрыць беларускую школу ў Муцькаўцах адмовіліся. Віленская Куратория Школьная паведаміла паперай за № 1-380-30, што дэкляраці паданы ў 1929 годзе з дамаганьнем увядзеньня выкладовае беларускае мовы ў школе ў Муцькаўцах ня могуць быць узяты пад развагу, бо ў той час, калі былі паданы дэклярацыі, у Муцькаўцах школы яшчэ ня было.

Словам, закон астаўся законам, а школы беларускай як ня было, так і няма.

Цяпер пасьля дэкрэту Прэзыдэнта, дзе сказана, што зьмяніць выкладовую мову ў школе можна толькі за 7 гадоў ад дня завядзеньня выкладовае мовы ў школе, аб беларускай школе астаецца толькі сьніць.

Закон астаўся мёртвай літарай, а на мейсца яго паказалася „добрая воля“ польскіх уладаў да беларускае школы!

Муцькаўскі.

ЦІ ЁСЬЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ АПАЛЯЧЫЦЬ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ?

Куцэвічы, Ашмянскага павету. У ва ўсей нашай гміне, так як і ў цэлым нашым краю, вялізарная большасьць жыхарства — беларускае сялянства. Дзе ня дзе двор з польскім панам або з расейскім барынам, а так-жа то сям то там раскінены ваколіцы апалячэлай беларускай шляхты. На рынках, у вёсках, а нават і ў шляхэцкіх ваколіцах штодзеннай мовай ёсьць мова беларуская. На вясельніх і іншых сямейных урачыстасьцях красуецца беларуская народная песьня і традыцыйныя народна-беларускія гульні.

Толькі гмінная канцэлярыя, пошта, касьцёл, царква, школа, паліцэйскі пастарунак і дворная адміністрацыя адыгрываюць ролю казёншчыны, ня робячы ніякіх уплываў на акружаючыя іх сялянскія масы. Гэтыя інстытуцыі з складамі польскае ці расейскае культуры жывуць сваім жыцьцём, а народ сваім. Сялянства, інстынктоўна вычуваючы ня свойскасьць гэтых інстытуцыяў, зьвяртаецца да іх толькі ў справах неабходнае патрэбы.

Як бачым, апалячыць нашых людзей няма ніякае магчымасьці. Права натуры перамагае ўсё.

Дык ідучы за правам натуры нам трэба пашыраць і паглыбляць сваю родную беларускую культуру. Прасьвета вывядзе нас з путаў няволі цемры і праз яе дойдзем мы да лепшых і сьвятлейшых дзён нашага жыцьця.

081530

Робячы пачатак, пракладаньня цьвёрдыя сьцежкі да лепшых часоў, выпісывайма і чытайма родныя беларускія газэты. Закладайма беларускія арганізацыі. Чытайма беларускія кніжкі і стойка змагаймася за правы свайго народу!

Вясковы беларус.

МОЛАДЗЬ ЛЮБІЦЬ СВАЁ РОДНАЕ.

Замоша, каля Браслава. Наша моладзь ня любіць заходзіць у польскі „людовы дом“ ваўсковых асаднікаў, не займаецца яна забаўкамі і з гарэлкай. Ня маючы сваей беларускай арганізацыі, якая вельмі патрэбная для моладзі, арганізуе традыцыйныя беларускія гульні ў вольны час ад працы.

У часе сьвяткаваньня Каляд і Новага Году моладзь наша вельмі ўдала гуляла ў народную беларускую гульню „Жаніцьба Цярэшкі“.

Гэтая гульня у нас вельмі распаўсюджана. На гэту гульню з вялікай любасьцяй прыглядаюцца і старэйшыя.

Словам, сваё роднае—кожнаму любое: моладзі і старэйшым. Чужое да душы нашае моладзі ніяк не прыстае. З гэтага ясна, што высілкі накінуць чужую нам культуру напрасны.

І. П.

НЕ ЗАЦЬВЯРДЖАЮЦЬ НАВАТ ПАЖАРНАЙ КАМАНДЫ.

Палачаны, Маладэчанскага пав. Пажар на вёсцы—гэта рэч страшная. Густа пабудаваныя вёскі ў выпадку пажару згараюць дашчэнту. Пажарная каманда на вёсцы таксама як і ў месьце так жа вельмі патрэбная.

Дзеля гэтага ў нашай гміне даўно ўжо зарганізавалася пажарная каманда, але да гэтай пары адміністрацыйныя ўлады яе не зацьвярджаюць. Прычына не зацьвярджаньня — як кажуць, — каб гэтая арганізацыя пасьля ня ладзіла беларускіх прадстаўленьняў. Калі гэтая прычына перашкаджае легалізацыі, дык сапраўды сьмешна і дзіўна. Кажуць, што ўжо скора залегалізуюць, бо адбыліся на нова перавыбары прэзыдыюму каманды.

Сарока.

„Беларуская Крыніца“ у месяцы лютым с. г. выйдзе дня: 7, 13, 20, 27.

Усячына.

Страшная помста коткі У Косаўскай гміне, таго-ж павету, здарыўся страшны выпадак помсты коткі за кацянё

Аднаго дня 2 гадоў хлопчык сын Мілярдовічаў забаўляючыся з малым кацянём, укінуў у распаленую печ. Пакуль старэйшыя гэта ўбачылі, кацянё у печы згарэла. Котка бачачы гэта у той час толькі жаласна мяўкала. Пасьля гэтага котка вынесла некуды з хаты астаўшыхся з кацянат і толькі ў ночы пасьля двух дзён памсьцілася за сваю крыўду. Калі ўсе спалі і спаў хлопчык, які ўкінуў у печ кацянё, котка напала на сьпячага хлопчыка і задушыла яго на сьмерць зубамі за горла.

Бальшавікі прадаюць людзкія трупы. Людзкія трупы, як ведама, патрэбны ў унівэрсытэцкіх просэкторыях, дзе вучацца студэнты на дактароў. Даставаць людзкіх трупоў для унівэрсытэцкіх уладаў даволі трудна, бо хто-ж хоча аддаць трупа свайго бацькі, маткі, жонкі, мужа, дзіцяці ці сваяка, каб студэнты рэзалі яго.

Ведаючы аб гэтым камуністы заняліся даставай людзкіх трупоў з Расеі на цэлы сьвет. Паўстала ўжо ў Расеі спэцыяльнае Бюро, якое зьбірае людзкія трупы, якіх там хапае і прадае іх заграніцу.

Абуваюць у дзеравякі. Маскоўская газэта „Праўда“ падае, што бальшавіцкая ўлада пастанавіла з недахопу скуры, вырабляць падэшву з дрэва. Бальшавікі цьвердзяць, што дзеравяная падэшва сусім добра можа замяніць падэшву скураную. Пэўнеж—як няма ботаў, то добрыя і дзеравякі!

З Вільні.

Безрабоцьце. Паводле ўрадавых падлічэньняў, на абшары Віленскага ваяводзтва запісана 5225 безработных. За апошні тыдзень лік безработных павялічыўся на 176 асоб.

Цэны ў Вільні. Паводле газэтных вестак на хлебным рынку 26 г. м. былі наступныя цэны: за 1 мэтрычны цэнтнар (6 пудоў і 10 ф.) жыта 18.00 — 19.00 зл., аўса — 21.00—22.00 зл., ачменю на кашу—18.00 — 19.00 зл., браварнянага ячменю—25.00—26.00 зл., пшанічнай мукі вышэйшага гатунку — 50.00 — 60 зл., пшанічнай мукі „0000“ — 40.00 — 50.00 зл., жытняй мукі — 34.00 — 35.00 зл., пшанічных вотрубаў — 15.00 — 16.00 зл., жытніх вотрубаў—11.50—12.00 зл., льняных жмыхоў — 30.00 — 31.00 зл., гароху звычайнага — 25.00 — 28.00 зл., гароху „Вікторыя“ — 30.00—35.00 зл., чырвонай канюшыны — 250.00 — 350.00 зл., белай канюшыны — 270.00 — 370.00 зл.

Засноўвайце гурткі Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры! Дзе ёсьць хоць трох сьведамых беларусаў жадаючых працаваць на ніве культурнага і гаспадарчага адраджэньня Беларусі, там павінен быць гурток Інстытуту.

Выпісвайце статут, інструкцыі і пачынайце арганізацыйную працу!

Адрас Інстытуту: Вільня, Людвісарская вул. 1—19.

Наша Пошта.

Вясковаму Беларусу. Карэспандэнцыю атрымалі, дзякуем, карыстаем, пішыце больш. Газэту пасылаем акуратна, трэбуйце на пошце.

І. Пупіну. Атрымалі, дзякуем, карыстаем, пішыце больш. Газэту Вам і Бройку пасылаем. Чытайце і пашырайце.

Чэрніку. Газэту пасылаем. Друкі Інстытуту высланы Вам. Пішыце аб жыцьці ў вашых ваколіцах

Трыпуцьку. Справа ўся ня ў выбарах, а ў народзе. Каб народ быў моцны, трэба пашыраць сьведамасьць. Дык рабеце і Вы гэта, пашырайце сярод сялян беларускую газэту і кніжкі. Беларуская сіла ў беларускім народзе, трэба яе толькі разбудзіць. Газэту пасылаем, пішыце, што ў Вас чуваць.

Кот. За газэту трэба прысылаць грошы паштовым пераводам. Адрас: „Biel Krynica“ Wilno, Ludwisarska 1—19.

Іванчыку. Газэту пасылаем, падпісную плату высылайце поштай.

Баркоўскаму. Грошы 4 зл. атрымалі 5.I, а прэмію выслалі 16.I. Дзеля таго, што Вы спазьніліся, да 1.I Вас ня ўсьпелі ўпісаць у „карту прэнумэраты“ на гэты месяц. За гэты месяц высылаем усе нумары асобна, а далей будзем пасылаць нармальна.

Банелю. Вам газэты не спынялі і пасылаем заўсёды. Пішыце, што каля Вас чуваць. Заахвочвайце выпісываць газэту другіх.

Пабудзею. Грошы 2 зл. атрымалі. Дзеля таго, што Вы прыслалі пасьля 1.I—на гэты месяц не змаглі запісаць Вам газэты ў „карты прэнумэраты“. За гэты месяц высылаем Вам зараз, а далей будзем пасылаць нармальна, ўпісаўшы ў карты прэнумэраты.

Мілевічу. Карэспандэнцыю ад „Ш. М.“ і адрасы атрымалі. Карэспандэнцыя ўжо неактуальная. Газэту ўсім пасылаць будзем. Пішыце аб жыцьці і патрэбах вашых ваколіц.

Бітэлю. Газэту пасылаем, з карэспандэнцыі карыстаем. Пашырайце газэту і прасьвячайце сваіх суседзяў.

Грошы атрымалі ад: А. Малахоўскай — 12 зл. Кніжкі за 8.40 выслала бел. кн. „Пагоня“. рэшту грошай залічылі за газэту. Яна Рыдзіка ў Францыі — 5 зл. 17 гр. Фр. Туміловіча — 4 зл., паведаміце, якія Вам выслаць кніжкі ў прэміі. Я. Эмільянчыка — 1 зл. Конст. Кезіка — 1 зл. Дзякуем, газэту пасылаем.

Instrukcyi

Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury

III. Lehalizacyja hurtkoŭ.

Lehalizacyju hurtkoŭ prawodzić Centralny Urad (abo Addzieł) Instytutu.

Pa atrymańni zajawy ad arhanizataraŭ hurtka, Centr. Urad wynosić pastanowu ab zakładzinach hurtka i nieadkładna pasyłaje da adpawiednaha starasty zajawu ab tym, što taki hurtok zarhanizawaŭsia. Pa dwuch tydniach paśla wysyłki da starasty hetaha pawiedamleńnia, kali z boku starasty niama nijakich pieraškodaŭ, Centr. Urad pierasyłaje časowamu ŭradu hurtka pawiedamleńnie ab lehalizacyi hurtka.

Staršynia hurtka, pa atrymańni ad Centrali pawiedamleńnia, zaprašaje skarbnika i sekretara na pasiedžańnie. Na hetym pasiedžańni pryjmajecca da wiedama pastanowa ab lehalizacyi hurtka i namiačajecca plan pracy.

IV. Jak pačynać pracu?

Jak tolki hurtok dastanie ad Centrali pawiedamleńnie ab zalehalizawańni hurtka, urad hurtka zaraz-ža adkrywaje **zapis u siabry** Istytutu. Ad ustupajučaha siabra hurtok biare 2 załatoŭki (1 zł. siabroŭskaje składki i 1 zł. ustupnych) i zapiswaje nowaha siabra ŭ asobny, praznačany dla hetaha sšytok.

Kali skončycca zapis siabraŭ (na heta treba praznačyć jaki miesiac času), urad hurtka pierasyłaje śpis usich siabraŭ u Centr. Urad, katory zaraz-ža wysyłaje siabroŭskija bilety, štamp i kruhłuju piačatku.

Pry zapiswańni ŭ siabry ŭrad hurtka pawinien staracca, kab hurtok mieŭ jak najbolš dziejnych i idejnych siabraŭ. Treba wyścierahacca roznych prawakataraŭ i prajdziświetaŭ, jakija swajej dziejnaściaj mahli-b skampramitawać našu arhanizacyju, abo jakim inšym sposabam paškodzić u jaje raźwićci i pracy.

Ad jakich hadoŭ možna prymać u siabry hurtka, ab hetym u Statucie T-wa ničoha nia skazana. Tam pišacca tolki, što „sapraŭdnym siabram moža być kožnaja fizyčnaja abo praŭnaja asoba, jakaja ŭnosić na mety T-wa siabroŭskuju składku ŭ sumie 1 zł. u hod i ŭstupnych 1 zł. adnarazowa“. (§ 10 b). Radzicca pryniać tych, jakija swajej pracaj, nia hledziačy na swoj wiek, mahli-b pryniaści jak najbolš karyści dla Instytutu.

V. Ahulnaje sabrańnie siabraŭ Hurtka.

Pa atrymańni z centrali siabroŭskich biletaŭ, časowy ŭrad pawinien pakłapacicca, kab sklikać ahulnaje sabrańnie siabroŭ hurtka i wybrać užo stały ŭrad. Treba trymacca taho prawiła, što da kanca hodu moža ŭradawać časowy urad, a pa Nowym hodzie (u studni miesiacy) na zwyčajnym ahulnym sabrańni wybirajecca ŭžo stały urad, u katory mohuć uwajści i siabry časowaha ŭradu, kali hetaha žadaje ahulnaje sabrańnie.

Ab usialakich ahulnych sabrańniach i schodkach hurtka treba pawiedamlać swaju wałasnuju palicyju na try dni pierad schodam. Idučy na ahulnaje sabrańnie, treba ŭziać z saboju siabroŭski bilet. Biez siabroŭskaha biletu palicyja moža na schod nia puścić. Pawiedamleńnie ŭ palicyju ŭrad hurtka moža napisać u takoj formie:

(Miesca štampu)
dn. . . . . 193 . . h.
Nr. . .
P. Kamendantu pastarunku palicyi
. . . . . . wołaści
u . . . . . .

Hetym pawiedamlajem, što dnia . . . . sioleta ŭ . . . hadzinie ŭ kwatery hurtka adbudziecca ahulny schod hurtka z nastupnym paradku dnia:

1) Sprawazdača ŭradu,
2) Wybary ŭradu hurtka,
3) Biahučyja sprawy.

(Napisać toj paradak, jaki prajektu ecca. U biahučych sprawach abhawarecie mahčymaści Waša pracy).

Staršynia Ŭr. Hurtka:

Sekretar Ur. Hurtka:

UWAHA: Usie zajawy da miascowych pawiatowych i wajawodzkich uładaŭ možna pisać pabiełarusku (łacinkaj ci hraždankaj), ale na abšarach: Bielskaha, Biełastockaha, Sakolskaha i Aŭhustoŭskaha pawietaŭ možna pisać tolki papolsku. Dziela hetaha padajom formy niekatorych zajawaŭ papolsku. (Na sabrańniach hutarki, dyskusii i h. p. i ŭ hetych pawietach mohuć adbywacca pabiełarusku).

Białoruski Instytut
Gospodarki i Kultury
Koło w . . . . .
Dn. . . . . . 193 . . r.
Nr. . . . .
Do Pana
Komendanta poster. polic. państwowej
w . . . .

Niniejszem uprzejmie komunikujemy, iż dnia . . . . r. b. o godzinie . . . w lokalu koła odbędzie się ogólne zebranie członków Koła Instytutu z następującym parządkiem dziennym:

1) Sprawozdanie Zarządu,
2) wybory Zarządu Koła,
3) sprawy bieżące.

Sekretarz Zarz. Koła. Prezes Zarządu Koła.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец Янка Шутовіч